УДК 821.161.3.09

*Л.М. Грыцук* (г. Брэст, Беларусь)

# ЖАНРАВАЯ СПЕЦЫФІКА ТВОРЧАСЦІ М. БАГДАНОВІЧА

Максім Багдановіч вялікае значэнне надаваў класічным формам паэзіі, выпрацаваным шматвяковай гісторыяй сусветнай літаратуры. Ён распрацоўваў цвёрдыя формы верша, такія як санет, трыялет, актава, тэрцыны, рандо, рандэль, танка, а таксама вядомы з антычных часоў элегічны двуверш. У пачатку ХХ стагоддзя паэзіі не былі характэрны строгая жанравая ўнармаванасць і наследаванне паэтычнаму канону, аднак у М. Багдановіча такое перайманне класічных узораў падтрымлівалася ідэямі адраджэння нацыянальнага мастацкага слова. Класік беларускай літаратуры лічыў неабходным аднаўленне культурнай пераемнасці эпох. Зварот Максіма Багдановіча да мастацкіх каштоўнасцей мінулых часоў можна тлумачыць ідэямі нацыянальнага адраджэння: адраджэннем гістарычнай свядомасці людзей, нацыянальнай культуры і мовы, і, урэшце, беларускай дзяржаўнасці.

У гэтым кантэксце вельмі цікавым уяўляецца аналіз асаблівасцей элегічнай творчасці М. Багдановіча. Элегія вядома яшчэ з часоў першых Алімпіяд, калі яна выконвалася пад акампанемент флейты і ўяўляла сабой двухрадкоўе, якое складалася са спалучэння гекзаметра і пентаметра. Антычныя элегіі тэматычна падзяляліся на патрыятычныя, філасофскія, любоўныя, застольныя, а таксама элегіі на пахаванне. Да жанру элегіі звярталіся паэты розных часоў і краін. У беларускай літаратуры асабліва выразна магчымасці жанра элегіі ўсіх відаў раскрыліся ў творчасці М. Багдановіча. Прычыны гэтаму былі аб'ектыўныя і суб'ектыўныя. Пачатак ХХ стагоддзя вызначаецца як эпоха войн, рэвалюцый, якія выклікалі страты ранейшых пазітыўных ідэалаў і пошук новых. Да суб'ектыўных прычын можна аднесці асабісты лёс М. Багдановіча, а таксама лёс яго сям'і: страта ў раннім дзяцінстве маці, брата, сясцёр. Вершы М. Багдановіча выяўляюць уплывы антычнасці, Рэнесансу, класічнай і народна-песеннай культуры шэрагу краін Еўропы і Азіі, сучасных паэту заходнееўрапейскіх літаратурных плыняў. Як вядома, талент Максіма Кніжніка развіваўся на ўзорах класічнай паэзіі, бо творы класікаў заўсёды былі своеасаблівым стрыжнем адукацыі ў інтэлігенцкіх сем'ях. Пасля рэвалюцыі 1905–1907 гадоў Багдановіч разумее, што пачынаецца Адраджэнне, ён і сам адчувае сябе адраджэнцам. Гэтае пачуццё вымушае яго шукаць новыя для беларускай літаратуры тэмы і формы. Малады паэт арыентуецца на мастацтва антычнасці, на анталагічную лірыку А. Фета. Але трэба адзначыць, што рэмінісцэнцый з вершаў Фета ў нашага аўтара няшмат. Мы знаходзім у Багдановіча толькі асобныя фетаўскія метафары, міфалагічныя вобразы антычнасці. У Фета ў большай ступені ён вучыўся ўменню злавіць

імгненне, больш глыбока адчуваць эмацыянальнае жыцце чалавека, яго перажыванні, пачатковым навыкам імпрэсіянізму. Паэзія Багдановіча ў асобных выпадках жыццесцвярджальная, аптымістічная, пра што сведчыць і апошні напісаны ім верш. Але адразу кідаецца ў вочы, што аптымізм яго сумны, з алюзіяй на прадчуванне нечага, падчас невыказанага словам, трагедыйнага. У цэлым паэзія класіка нашай літаратуры мае элегічны характар. Многія творы падпадаюць пад жанравую класіфікацыю элегіі.

М. Багдановіч выводзіў развіццё беларускай мовы, літаратуры, культуры з агульначалавечых вытокаў, таму і перакладаў вершы Гарацыя, Авідзія, Катула, Анакрэона, Сафо, Вергілія і інш. Асветнік, адраджэнец, ён разумеў, што без ведання гісторыі не толькі сваёй краіны, але і краін свету нельга лічыць сябе дасведчаным чалавекам. З такога пункту гледжання вынікае яго выснова, што жанры і жанравыя формы (санет, у прыватнасці) з'яўляюцца прыдатнымі для выражэння агульначалавечых думак, пачуццяў, падобна творам старажытных аўтараў, і на беларускай мове.

Багдановіч разумеў, што ў беларускую літаратуру трэба ўводзіць формы, якія прыжыліся ў іншых нацыянальных літаратурах: пентаметр, гекзаметр, трыялет, санет, актава, тэрцына. Ён лічыў, што калі беларуская літаратура не засвоіць лепшыя традыцыі сусветнай культуры, то і надалей будзе заставацца на нізкім эстэтычным узроўні. Выкарыстоўваючы сусветны вопыт вершаскладання, ён прывіваў беларускай літаратуры новыя якасці: імкненне да індывідуалізацыі лірычнага пісьма, узмацнення асабістага пачатку ў ім, паглыблення псіхалагічнага аналізу.

М. Багдановіч пісаў пасля першай рускай рэвалюцыі, калі выразна адчувалася разбурэнне былога расійскага ладу жыцця. Творчасць беларускага паэта ўвабрала ў сябе адзнакі літаратурных традыцый, напрацаваных у Еўропе ў пачатку XX стагоддзя: і сімвалізму, і імпрэсіянізму, і, вядома, рэалізму. Расчараваны ў рэаліях тагачаснага жыцця, паэт выкрывае яго супярэчлівасць і драматызм, супрацьпастаўляе рэчаіснасці свой эстэтычны ідэал. Гэты ідэал існуе ў душы героя – гэта яго мара, экзатычная і яркая казка: "І марылі астры ў цудоўнаму сне / Аб зёлках шаўковых, аб сонечным дне. / І казачны край падымаўся з іх сна, / Дзе кветкі не вянуць, дзе вечна вясна..." [1, с. 194].

Рамантызм Багдановіча грунтуецца на нацыянальна-культурнай традыцыі. Пры шэрым цячэнні будзённага грамадскага жыцця, калі духоўны пачатак у чалавеку падаўлены, імкненне Багдановіча ад рэальнага да ўзвышанага, духоўнага не знаходзіла задавальнення ў тым, што адбывалася вакол яго ў свеце. Рамантычныя тэндэнцыі ў паэзіі "Максіма-кніжніка" асабліва выразна выступаюць у лірыцы кахання. Творца шчыра піша пра гэтае ўзнёслае пачуццё. Ад рэчаіснасці, якая не спраўдзіла надзей паэта, Багдановіч ідзе ў свет інтымнага і патаемнага, казачнага, віртуальнага: "Усё вышэй і

вышэй я на гору ўзбіраўся, / Падымаўся да сонца, што дае нам цяпло: / Але толькі чым болей да яго набліжаўся, / Тым усё халадней мне й маркотней было" [1, с. 133].

Элегія – вядучы жанр рамантыкаў, як і балада. Элегія рамантыкаў узяла за ўзор элегію мінулай для яе эпохі – эпохі класіцызму. Элегія ў эпоху рамантызму набывае новы змест. Вядомы даследчык рускай элегіі Л.Г. Фрызман піша: "З надыходам рамантычнай эпохі ў сэнсавай і стылістычнай сістэме элегіі адбываюцца рашучыя зрухі. Яны караняцца ў самой філасофіі рамантызму. "Журботны змест", які з'яўляецца, як вядома, сэнсавай асновай элегіі, становіцца для рамантыкаў ужо не адной з нот у агульнай гаме успрыняцця, але нейкай дамінантнай" [3, с. 5]. Калі элегіі класіцыстаў пісаліся або на смерць, або ў іх лірычны герой перажывае няшчаснае каханне, то элегіі рамантыкаў умясцілі ў сябе і так званыя "вечныя" тэмы: жыцця і смерці, чалавечага быцця, долі – нядолі і інш. Канешне, рамантыкі працягваюць пісаць і любоўныя элегіі, і элегіі на смерць, аднак гэтыя тэмы становяцца новымі, па-іншаму пераасэнсоўваюць чалавечае жыццё і самога чалавека ў свеце. Ад адчування незадаволенасці светам, усім існым, нікчэмным паэт-рамантык імкнецца да чыстага ідэалу.

У рамантычнай элегіі лірычны герой перажывае няшчасці ў існуючым свеце, адчувае сілу зла, набывае ўяўленне аб тым, што шчасце – зменлівы стан. Элегія не тлумачыла прычыны няшчасцяў, таму што няшчасці, смутак не былі абумоўлены часам і таму што "тады сам гэты смутак страціў бы той усёабдымны, "касмічны" характар, які ён меў у рамантычных элегіях" [3, с. 9].

Эпоха рускага рамантызму – першая палова XIX стагоддзя. У Беларусі рамантызм набывае цвёрдую пазіцыю значна пазней, таму элегічныя творы М. Багдановіча больш удала ўпісваліся б у стылёвую парадыгму пачатку XIX стагоддзя. Як сцвярджае Я.А. Гарадніцкі, у творчасці аднаго і таго ж беларускага аўтара могуць суіснаваць творы, прыналежныя да розных стыляў і напрамкаў. Адметнасць беларускага мастацкага шляху ў тым, што "ў нашай літаратуры сімптаматыка асобнага мастацкага напрамку ў большай ступені факусіруецца ў паасобных творах, чым у цэлым у творчасці таго або іншага аўтара або групы аўтараў" [3, с. 56].

Адметнасць рамантычных элегій М. Багдановіча заключаецца ў тым, што рэалістычныя замалёўкі ён напаўняе міфалагічнымі вобразамі, дае кароткія, як у імпрэсіяністаў, імгненныя апісанні з'яў. Нерэалістычны свет дапамагае паэту раскрыць зацікаўленаму чытачу наваколле па-іншаму, зазірнуць у яго патаемныя куточкі. У творах паэта прысутнічае дух рамантычнага ідэалу, мэта якога – дапамагчы спасцігнуць сутнасць душы чалавека. Яшчэ з даўніх часоў міфалогія ў фантастычнай форме перадавала першабытныя назіранні чалавека над жыццём прыроды і грамадства, з'ўлялася вынікам

народнай мудрасці. Рамантызм Багдановіча звязаны з прыродай, якая сама – казка, міф, а таму праз з'явы прыроды паэт глыбей апісвае чалавечыя пачуцці:

У небе – ля хмары грымотнай – празрыстая, лёгкая хмара
Шпарка плыла, і абедзве чагось чырванелі ад жару.
Зліцца жадалі яны, зрабіліся б хмарай магутнай,
Але далёка іх вецер разнёс, наляцеўшы нячутна [1, с. 58].

Такім чынам, элегіі Максіма Багдановіча ўтрымліваюць наступныя рысы рамантычнага тыпу творчасці: 1) аўтар супрацьпастаўляе суровай рэчаіснасці ўзвышанага героя; 2) на нейкія моманты паэт як бы ўцякае ад сучаснасці ў свет пачуццяў, у свет кахання, мары; 3) лірыка паэта мае двухпланавы характар, паказвае быццё як бы ў двух люстэрках: адно – казачна-фантастычнае, другое – рэальнае; 4) выкарыстоўвае такія мастацкія прыёмы, як антытэза, гіпербала, гратэск, што ўласціва рамантычнаму і мадэрнісцкаму стылю пісьма ў большай ступені, чым рэалістычнаму; 5) паэзія Багдановіча носіць узвышаны эмацыянальна-патэтычны стыль.

Тэматычна элегіі М. Багдановіча можна падзяліць наступным чынам: 1) сацыяльна-грамадзянскія; 2) элегіі на тэму прыроды; 3) псіхалагічныя; 4) філасофскія элегіі.

Сярод першых элегій можна адзначыць тыя, у якіх паэт адкрывае сваймy народу шляхі да абуджэння духу ("Кінь вечны плач свой аб старонцы!"), а таксама элегіі на тэму народнага гора і нядолі ("Зразаюць галіны таполі адну за адной..."). У іх часта чуецца заклік да дзеяння, да змены існуючага цяжкага становішча беларуса ("Рушымся, браццв, хутчэй", "Нашых дзедаў душылі абшары лясоў", "Ўстань, навальніца, мкні нанова" і інш.): "Рушымся, брацця, хутчэй / Ў бой з жыццём, пакідаючы жах, / Крыкі пужлівых людзей / Не стрымаюць хай бітвы размах" [1, с. 112].

У адным з вершаў ("Нашых дзедаў душылі абшары лясоў") М. Багдановіч дае рэтраперспектыву ў гісторыю народнага змагання, якая, на думку паэта, можа служыць прыкладам да пошуку сённяшняга спосабу барацьбы за сацыяльную роўнасць: "Нашых дзедаў душылі абшары лясоў, / Не давалі ім жыці праўдзівым жыццём, / І яны тыя пушчы звадзілі агнём, / Іх кругом падпаліўшы з далёкіх канцоў" [1, с. 113].

У пейзажных элегіях паэта выразна адчуваецца трагізм чалавечага быцця: "Месяц выплыў над змрочнай, заснуўшай зямлёй, / І павёў яго ў цёмную даль за сабой", аднак гэты шлях прыводзіць лірычнага героя не "ў той край, дзе пануе вясна", а "пайшоў ён па шляху, пайшоў аж да дна: / Агарнула яго цішына, глыбіна" [1, с. 66]. М. Багдановіч звяртаецца да розных праяў навакольнага свету, шукае ў іх падтрымкі. Аднак зоркі і месяц, хмары і дождж, бура і мяцеліца не дапамагаюць яму ажыццявіць сваю мару. У вершы

"У небе – ля хмары грымотнай" паэт жадае паяднацца з радзімай, аднак дзве хмары не аб'ядноўваюцца, каб набыць моц, і, як вынік, гінуць паасобку. Так і М. Багдановіч гіне далёка ад Радзімы: "І паасобку загінулі мары бяздольныя тыя, / Чуючы ў небе, як вецер над смерцю іх радасна вые" [1, с. 58]. Паэт яднаецца з прыродай, добра адчуваючы яе стан, шукае выйсця з цяжкага становішча. На жаль, ні вечар, ні ноч, ні зіма, ні вясна не даюць таго спакою, які шукае аўтар: "Ў небе вячэрнім, зялёным, як лёд; / Іскрацца зорак сняжынкі маркотна, / Збожжа пакрылася шызай расой... / Кіньма жа думкі аб долі гаротнай, / Хоць бы на момант спачынем душой! [1, с. 65].

Да псіхалагічных элегій належаць тыя, што выражаюць духоўнае "я" паэта, дазваляюць выкрыць прычыну яго тугі. Дарэчы, гэта тэма часцей за другія затрымлівае на сабе мастацкую ўвагу М. Багдановіча. Смуткам і безнадзейнасцю напоўнены і тэмы аб такім светлым пачуцці, як каханне: "Сумна мне, а ў сэрцы смутак ціха запявае: / "Сцежка ў полі пралягае, траўкай зарастае. / Каля сцежкі пахіліўся явар да каліны, – / Там кахаліся калісь-то хлопец і дзяўчына" [1, с. 81].

Філасофскія элегіі закранаюць тэмы аб пачатку жыцця і яго сэнсе ("Прывет табе, жыццё на волі", "Жывеш не вечна, чалавек"), аб нікчэмнасці жыцця ("Сеў хлопчык з шкляначкай ля вулічнага ганку"), аб смяротнасці фізічнага існавання чалавека ("Шмат у нашым жыцці ёсць дарог", " З М. Чарняўскага"): "Ўжо зноў не спаткаюцца тыя шляхі, / Якімі ў жыццё / Выходзілі мы зрання, / Мы ўсе пакляліся, маўляў жаніхі, / Да смерці ядынае меці каханне. / А як разышліся – пакінулі нас / Заходы і думкі высокія ўраз" [1, с. 192]. Часта ў элегіях дамінантнай тэмай выступае раўнадушнасць як характэрная рыса чалавечых узаемаадносін, калі адны спакойна назіраюць гора іншых: "І бестрывожна бачаць зоры, / Як тонуць людзі з карабля" [1, с. 131]. Аднак, на думку Яна Чыквіна, лірычны герой М. Багдановіча "ўсе праблемы і пытанні ўспрымае праз сваё індывідуальнае існаванне, праз адчуванне сваёй "закінутасці ў жыццё", у быційнасць" [4, с. 211]. Нельга пагадзіцца з такім меркаваннем даследчыка, таму што элегіі М. Багдановіча маюць філасофскі характар, што само па сабе сведчыць аб усеагульнасці закранаемых тэм і праблем, якія ва ўсе часы з'яўляліся прадметам зацікаўлення многіх паэтаў.

У межах стылістычнай кампазіцыі элегій М. Багдановіча агульны трагізм становішча чалавека выразна адчуваецца дзякуючы мастацкім тропам, у прыватнасці, эпітэтам. Некаторыя з іх узяты аўтарам з рэальных праяў нашага жыцця, іншыя – абстрактныя (эмацыянальна-псіхалагічныя). Многа "змрочных" эпітэтаў, пры дапамозе якіх паэт удала перадае ўсю паўнату колераў і фарбаў. Метафары надаюць элегічным вобразам дынамічны характар, дазваляюць адчуць іх яркасць і пластычнасць, імкненне да змен, зрухаў (асабліва ў сацыяльна-грамадзянскіх элегіях). Параўнанні, якія будуюцца

на аснове паралелізму прыроды і жыцця чалавека, падкрэсліваюць, што дух народны адраджаецца падобна сезонам у прыродзе.

Элегічная спадчына Максіма Багдановіча дае падставу сцвярджаць, што наш паэт быў выдатным майстрам ствараць мастацкія шэдэўры на беларускай мове, якія можна паставіць у адзін рад з найлепшымі ўзорамі антычнай паэзіі і пазіі заходнееўрапейскіх краін.

**Літаратура:**


1. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 752 с.
2. *Гарадніцкі, Я.А.* Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я.А. Гарадніцкі. – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 205 с.
3. *Фризман, Л.Г.* Русская элегия в эпоху романтизма / Л.Г. Фризман. – М., 1977. – 24 с.
4. *Чыквін, Я.* Максім Багдановіч і беларуская паэзія 20–30 гадоў // Dialog sztuk w kulturze Słowian wschodnich / [pod redakcją Jerzego Kapuścika]. – T. 2. – 451 c. – (Rosja).


УДК 821.161.3 – 3.09

*А.Я. Ждановіч* (г. Мінск, Беларусь)

## СЭНСАЎТВАРАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ "У КАПЦЮРОХ ГПУ" Ф. АЛЯХНОВІЧА І "АПОВЕСЦІ ДЛЯ СЯБЕ" Б. МІКУЛІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ ЖАНРАВА-СТЫЛЁВЫХ ПРЫКМЕТ ГЭТЫХ ТВОРАЎ

Сярод шэрагу твораў беларускай прозы першай паловы XX ст., якія маюць адметнасць у форме выяўлення аўтарскага светапогляду ў буйных жанрах, можна назваць "У капцюрох ГПУ" Ф. Аляхновіча (1934–1942) і "Аповесць для сябе" (1946–1948) Б. Мікуліча.

Жанравыя азначэнні "У капцюрох ГПУ" даволі неадназначныя: дакументальная аповесць [9, с. 525; 13, с. 18], успаміны, дакументальнае сведчанне [5, с. 9], своеасаблівы дзённік (пра гэта ў анатацыі да кнігі – [2]), "*нарысы Ф. Аляхновіча, падобна кадрам кінахронікі, разгортваюць адзін за адным малюнкі лагернага жыцця*", успаміны [5, с. 354], мемуары [12, с. 78].

Пры характарыстыцы "Аповесці для сябе" таксама выкарыстоўваюцца розныя жанравыя азначэнні: дакументальна-мастацкі твор, "*гэта не ўспаміны, а жывое сведчанне часу. Гэта трагічная споведзь чалавека, апантана захопленага мастацтвам, у якога адабралі магчымасць тварыць, адабралі*